**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2020 г.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу "Летнее чтение с увлечением"

Ва ўсіх бібліятэках сістэмы прайшлі мерапрыемствы з дзецьмі ў рамках раённага конкурсу «Летнее чтение с увлечением».

**2 жніўня**

У бібліятэцы на літаратурным вечары «В брызгах солнечного света ходит с книгой наше лето» дзеці з задавальненнем чыталі вершы пра лета і разгадвалі загадкі, малявалі, гулялі ў рухавыя гульні. Завяршылася мерапрыемства салодкім сталом пад адкрытым небам.

*Паляцічская ПБ, 25 чал.*

**6 жніўня**

Бібліятэкар арганізавала экскурсію «Мая малая радзіма» для ўдзельнікаў аматарскага клуба «Каласок». Дзеці даведаліся аб паходжанні назвы вёскі Тэўлі, наведалі памятныя і гістарычныя месцы, а ў комнаце народнай творчасці дзякуючы цікавым экспанатам пазнаёміліся з жыццём і побытам продкаў.

*Тэвельская ПБ, 15 чал.*

**14 жніўня**

На творчай майстэрні «Умелыя ручкі» для дзяцей прайшоў майстар-клас па маляванню на шкле.

*Астроміцкая ПБ, 20 чал.*

**15 жніўня**

Пасяджэнне аматарскага клуба «Аленький цветочек» прайшло ў фармаце інтэлектуальна-забаўляльнай праграмы «Суём свой нос в любой вопрос». Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны па бяспецы летам, гулялі ў гульні «Светлафорная», «З агнём жарты дрэнныя», «Вітамінавая» і літаратурнае лато «Знаўцы літаратуры». Скончылася мерапрыемства аглядам літаратурнай выставы «Маленькія дзеці на казачнай планеце».

*Буховіцкая ПБ, 16 чал.*

**16 жніўня**

Літаратурную гульню «Под алыми парусами» ў бібліятэцы прысвяцілі 140-годдзю з дня нараджэння А. С. Грына. Віктарына па біяграфіі і творчасці пісьменніка вызначыла лепшых знаўцаў. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «К мечте на алых парусах».

*Верхалеская ПБ, 26 чал.*

**16 жніўня**

Казачная гульня-віктарына «Волшебный сундучок» па беларускіх і замежных казках прайшла ў бібліятэцы. Пераможцы Сафія Нікуліна, Ангеліна Усцьянчык і Вікторыя Курыс узнагароджаны салодкімі падарункамі.

*Хідрынская ПБ, 23 чал.*

**19 жніўня**

На літаратурным свяце «Што чыталі гэтым летам мы раскажам без сакрэтаў» памятнымі падарункамі адзначаны лепшыя юныя чытачы лета. Усе прысутныя актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах «Словесный партрэт», «Закончы прыказку пра кнігу» і віктарыне «Загадкі ад Знайкі».

*Дзівінскі ф-л, 27 чал.*

**20 жніўня**

Бібліятэчны квэст «Адважныя шукальнікі скарбаў», які праходзіў у будынку бібліятэкі і на тэрыторыі каля яе, пачаўся з пазнавальнай экскурсіі. Затым дзеці атрымалі запаветную карту і выконвалі розныя заданні, звязаныя з літаратурай і бібліятэкай. Фіналам квэста стала знаходжанне «чароўнага скарба» - кнігі.

*Лукская ПБ, 20 чал.*

**21 жніўня**

Бібліятэчнымі вячоркамі «Яблочный Спас не пройдет без нас!» адзначылі ў бібліятэцы свята Пературварэння Гасподняга. Госцем мерапрыемства стаў настаяцель царквы Ушэсця Гасподняга аг. Гарадзец айцец Георгій. Дзеці даведаліся пра паходжанне слова «Спас», традыцыі святкавання, успаміналі прыказкі і прымаўкі, адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў віктарынах і гульнях і ў якасці пачастунка атрымалі яблыкі.

*Гарадзецкі ф-л, 28 чал.*

**23 жніўня**

Конкурсная праграма «Знайка-читайка» сабрала дзяцей на пляцоўцы каля бібліятэкі. Рабяты пазнаёміліся з навінкамі літаратуры, а затым двума камандамі ўдзельнічалі ў конкурсах, адказвалі на пытанні віктарын, складалі букеты з палявых кветак. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

*Магдалінская ПБ, 26 чал.*

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**5 жніўня**

Літаратурны клуб «ПоэтиКо» прэзентаваў зборнік вершаў «Глыток родных крыніц». Мерапрыемства адбылося каля Кобрынскага Палаца культуры.

*ЦРБ, 35 чал.*

**14 жніўня**

Цэнтральная раённая бібліятэка і Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава правялі сумеснае мерапрыемства «У госці да свахі», якое адбылося ў музеі. Дзякуючы экскурсіі па выставе «Народный костюм – живая традиция» прысутныя пазнаёміліся з асаблівасцямі кобрынскага строю, у тым ліку касцюма лелікаўскай свахі, традыцыі вырабу якога занесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Другой часткай праграмы стала выступленне членаў літаратурнага клуба «ПоэтиКо», які прыцуе пры бібліятэцы.

*(“Кобрынскі веснік”. 2020. 19 жніўня; «Кобрин-информ». 2020. 20 августа).*

*ЦРБ, 23 чал.*

**16 жніўня**

Жнівеньскае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце літаратурнай лабараторыі «Падбіраючы слова да слова». Паэты дзяліліся сваімі новымі вершамі, у тым ліку напісанымі адычнай страфой у якасці дамашняга задання, і вучыліся падбіраць метафары да слоў.

*ЦРБ, 8 чал.*

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

У межах Года малой радзімы да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «CITOMA» бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены бібліяграфічны паказальнік «”CITOMA”: час змяняецца – якасць застаецца» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына».

*(«Кобрынскі веснік». 2020. 8 жніўня).*

*ЦБР*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены інфармацыйна-метадычныя матэрыялы ў дапамогу бібліятэкарам у рабоце з дзецьмі і падлеткамі, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, пад назвай «В зоне взаимного доверия». Выданне прызначана перш за ўсё для супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк, але будзе карысным і для работнікаў іншых сфер дзейнасці, якія працуюць з непаўналетнімі, якія знаходзяцца на ўліку ў ІСН, ці з сем’яў у сацыяльна небяспечным становішчы.

*ЦРБ*